# I. Гістарычныя даты

| | |
|---|---|
| **105 год**<br>(19.01.1919 г.) | З дня абвяшчэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі(БССР; 1919-1991),саюзнай дзяржавы ў складзе Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. |
| **100 год**<br>(17.07.1924 г.) | Утварэнне Крупскага раёна. |
| **80 год**<br>(28.06.1944 г.) | Вызваленне г.п. Крупкі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. |

# II. Юбілеі прадпрыемстваў, установаў.

***Прадпрыемствы і арганізацыі***

| | |
|---|---|
| **100 год**<br>(17.07.1924 г.) | Крупскаму раённаму вузлу электрасувязі Мінскага Філіяла РУП электрасувязі "Белтэлеком" |
| **95 год**<br>(17.11.1929) | АТТ "Майскае – Агра". |
| **90 год**<br>(1934 г. ) | ДУ "Крупскі раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі". |
| **55 год**<br>(1969 г.) | Сяляўскаму лясніцтву. |
| **45 год**<br>(19.10.1979 г.) | ААТ "Крупскі райаграсэрвіс". |

***Навучальныя ўстановы***

| | |
|---|---|
| **155 год**<br>(верасень 1869 г.) | ДУА “Бобрскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад-сярэдняя школа ім. А. В. Луначарскага Крупскага раёна”. |
| **105 год**<br>(верасень 1919 г.) | ДАУ “Сярэдняя школа ім. В. А. Крыштопенка”. |
| **80 год**<br>(верасень 1944 г.) | ДУА “Крупская раённая гімназія”. |
| **55 год**<br>(1969) | ДУА “Абчугская сярэдняя школа” |
| **30 год**<br>(06.09.1994г.) | ДУА “Каласоўская сярэдняя школа Крупскага раёна”. |

## *Дзіцячыя сады*

| | |
|---|---|
| **80 год**<br>(ліпень 1944 г.) | ДУА “Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці “Сонейка” г. Крупкі”. |
| **65 год**<br>(верасень 1949 г.) | ДУА “Льнозавадскі  дзіцячы яслі-сад Крупскага раёна”. |
| **55 год**<br>(люты 1969) | ДУА “Яслі-сад № 2 г. Крупкі”. |
| **40 год**<br>(лістапад 1984 г.) | ДУА “Каменскі яслі-сад № 17 Крупскага раёна”. |

## *Рэлігійныя ўстановы*

| | |
|---|---|
| **130 год**<br>(21.10.1894 г.) | Храм Раства Прасвятой Багародзіцы в. Худаўцы. |
| **25 год** | |

(22.05.1999 г) Храм Свяціцеля Міколы Цудатворца г. Крупкі

***Установы культуры і спорту***

**30 год** (05.02.1994 г.) Фізкультурна-аздараўленчаму комплексу.

## III. Дзеячы навукі, мастацтва, літаратуры і спорта – знакамітыя землякі

**2 студзеня** (02.01.1954 г. в. Язбы)



**70 год** з дня нараджэння Змітрака Марозава, паэта, празаіка, публіцыста,члена СП Беларусі з 1992. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1988, за кнігу вершаў "Хлебны верасень). Нарадзіўся ў сялянскай сям'і.Выдаў паэтычныя зборнікі "Пад небам бусліным", "Агонь і жыта", "Хлеб і памяць" і інш. Піша апавяданні для дзяцей ("Азбука агранома Валошкі),публі цыстычныя нарысы пра беларускую вёску, мінулую вайну.

**24 лютага** (24.02.1954 г.в. Луцішча)



**70 год** з дня нараджэння Васіля Дзянісавіча Старычонка, мовазнаўца, літаратуразнаўца. Доктар філалагічных навук (1998).Даследуе пытанні беларускай лексікалогіі і дыялекталогіі, граматыкі і фаналогіі мовы. З 1977 года выступае ў друку. З'яўляецца аўтарам звыш 300 навукова-метадычных прац. Займаецца падрыхтоўкай вучэбна-метадычных дапаможнікаў па філалагічных дысцыплінах для студэнтаў і вучняў. Сярод

якіх “Лінгвістычныя аналізы”, “Беларуская мова ад А да Я”, “Беларуская мова: Узоры моўнага аналізу. Трэніровачныя заданні. Тэсты”.У 2015 годзе апублікаваны першы ў беларускай лексікаграфічнай практыцы “Беларуска-азербайджанскі слоўнік”.

**15 ліпеня**
(15.07.1939 -
14.05.2017 г.
в. Куплінка)



**85 год** з дня нараджэння Васіля Макарэвіча, паэта, празаіка,публіцыста.Аўтар сборнікаў паэзіі “Вогненая камета” (1963), “Мерыдыян і паралелі” (1966) “Сумежжа” (вершы, паэмы, 1989), “Везувій” (1993), кнігі вершаў, паэм і артыкулаў “Пяро і бліскавіца” (2001), зборнік сатыры і гумару “Даміно” (2005), кнігі выбранага “Неба ў руках” (2012). і інш..У 1994 годзе стаў лаўрэатам Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова, у 2012-м — лаўрэатам літаратурнай прэміі “Золотой Купидон”.

**18 жніўня**
(18.08.1954 г.
в. Баравыя)



**70 год** з дня нараджэння Аляксандра Паўлавіча Ксяндзова, мастака-жывапісца, графіка, прафесара Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтва. Творы мастака захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Траццякоўскай галерэі, калекцыі «Дойчэ Банка» ў Лейпцыгу (ФРГ), калекцыі барона фон Тобля ў Цюрыху (Швейцарыя) і іншых прыватных сборах Беларусі і замежжа.

**23 чэрвеня**
(23.06.1959 г.
в. Худава)



**65 год** з дня нараджэння Уладзіміра ІванавічаТайнікава, савецкага вясляра-байдарачніка, выступаў за зборную СССР у другой палове 1970-х гадоў. Чэмпіён свету, чатырохразовы чэмпіён нацыянальных першынстваў, удзельнік летніх Алімпійскіх гульняў у Маскве. На спаборніцтвах прадстаўляў спартыўнае таварыства "Спартак", заслужаны майстар спорту СССР (1978). Таксама вядомы як трэнер і спартыўны функцыянер.

# IV. Крупшчына гераічная

**3 чэрвеня**
(06.06.1924-
13.11.1943 г.
в.Чарнавосава)



**100 год** з дня нараджэння Аляксея Сцяпанавіча Лукашэвіча, Героя Савецкага Саюза. Да восені 1943 года самастойна падарваў 9 эшалонаў праціўніка, удзельнічаў у разгроме 5 валасных ўпраў, 2 разы пашкоджваў тэлефонную лінію сувязі немцаў.

**27 чэрвеня**
(27.06.1944г.
каля в. Абчуга)

**80 год** з часу здзяйснення подзвігу Іванам Астапавічам Мазгавым (14.10.1923-27.11.2004 г.), Героем Савецкага Саюза каля в. Абчуга Крупскага раёна.27 чэрвеня 1944 года экіпаж Мазгавога рамантаваў свой танк ў вёсцы Абчуга Крупскага раёна, калі праз



гэтую вёску праходзіла калона нямецкай тэхнікі. Прыняўшы няроўны бой, экіпаж абараняўся пяць гадзін, знішчыўшы 3 бронетранспарцёры, некалькі процiватанкавых гармат, 13 аўтамашын. Калі танк быў падпалены, Мазгавы закідаў нямецкіх салдат гранатамі, здолеўшы прарвацца з акружэння.

**27 чэрвеня**
(27.06.1944 г. ля г. п. Бобр)



**80 год** як загінуў ля г. п. Бобр оперупаўнаважны аддзела контрразведкі “Смерш” Васілій Міхайлавіч Чабатароў (25.06.1918-27.06.1944 г.),Герой Савецкага Саюза. 27 чэрвеня 1944 года танкі з мотастралкамі на бранi ўварваліся ў размяшчэнне нямецкіх частак на ўскраіне пасёлка Бобр і выбілі немцаў з занятых пазіцый. Каля гарадскога пасёлка Бобр у 2012 годзе быў створаны дастойны подзвіг Васілія Чабатарова мемарыял, к якому не зарастае народная трапа.

## Знакамітыя землякі – героі працы

**01лістапада**
(1.11. 939) г.
в. Кутавец



**85 год** з дня нараджэння Пятрушынай Веры Андрэе ўны, Героя Сацыялістычнай працы (1973г.), узнагарджана двума ордэнамі Леніна, медалямі.